# Абсягі трансфармацыі

Па апошніх звестках, агульная колькасць бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь складае 2686 (па стане на 01.12.2018 на аснове базы даных «Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь і замежных краін»), з іх публічных — 2574 (па стане на 01.07.2018 на аснове дзяржаўнай нфармацыйнай сістэмы «Інтэграваны банк даных устаноў культуры»).

Школьных бібліятэк на 1 снежня 2018 — 2578. На падставе аператыўных звестак, якія паступілі ў Нацыянальную бібліятэку Беларусь, засведчана: на 01.12.2018 у краіне дзейнічае 105 бібліёбусаў, якія абслугоўваюць 3505 населеных пунктаў.

Агульная колькасць бібліятэчных кадраў сукупнай сеткі бібліятэк рэспублікі складае, згодна з экспертнымі ацэнкамі, 12 тыс. чалавек, у тым ліку 5030 — супрацоўнікі публічных бібліятэк. Сярэдні ўзрост супрацоўнікаў публічных бібліятэк — у межах 40—49 гадоў. Большая палова з іх (53%) маюць вышэйшую адукацыю; 47% — сярэднюю спецыяльную; астатнія — прафесійна-тэхнічную або агульную сярэднюю.

На 01.07.2018 82% публічных бібліятэк Рэспублікі Беларусь аснашчаны камп'ютарнай тэхнікай. Агульны парк машын складае 8385 адзінак. 75% публічных бібліятэк маюць доступ да глабальнай сеткі інтэрнэт.

Колькасць штатных адзінак на 01.07.2018 складае 10263,67, спісачная колькасць усіх супрацоўнікаў публічных бібліятэк рэспублікі — 9994, у тым ліку бібліятэкараў — 6828,8 і 6478 адпаведна.

Прыведзеныя звесткі ўтрымліваюць паказчыкі дзейнасці НББ.